# АБ КАНСТЫТУЦЫЙНЫХ АСНОВАХ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ БЕЛАРУСІ Ў СВЕЦЕ СУЧАСНЫХ ВЫКЛІКАЎ

*Калінін С. А., БДУ*

19 лютага 2008 года албанцы-касавары прынялі Дэкларацыю аб стварэнні уласнай дзяржавы, анэксіраваўшы частку тэрыторыі Сербіі. Рэальныя вынікі гэтага вызначыць будучыня, але ўжо зараз можна сцвярджаць аб глыбокім сістэмным крызісе міжнароднага права, міжнародных інстытутаў і некаторых сучасных палітыка-прававых тэорый. Міжнароднае права засноўваецца (або ўжо *засноўвалася*) на прынцыпе суверэнітэта нацыянальнай дзяржавы, якая замяніла дзяржаву-імперыю, дзе тэрыторыя прысягала на вернасць каралеўскай асобе, захоўваючы сваю нацыянальную адметнасць. З'яўленне National State, гэта значыць аб'яднанне (імкненне да аб'яднання) нацыі ў адной дзяржаве, абумовіла праблемы нацыяналізму і абароны нацыянальнай ідэнтычнасці.

Адным з прынцыпаў міжнароднага права з'яўляецца абарона праў нацыянальных (рэлігійных) меншасцяў. Сапраўды, любая нацыянальная дзяржава (дзяржава большасці асоб адной нацыі) імкнецца выхоўваць у грамадзянах пэўны стэрэатып нацыянальных паводзін, адпавядаючы стэрэатыпу паводзін тытульнай нацыі, часам праводзячы палітыку дэнацыяналізацыі меншасці, што патрабуе для апошняй пэўных гарантый. Косаўскі прэцэдэнт сведчыць аб іншым: нацыянальна-рэлігійная меншасць, стаўшы дэмаграфічнай большасцю, карыстаючыся нормамі міжнароднага права і падтрымкай шэрага дзяржаў, стварыла невыноснае становішча для тытульнай нацыі, у тым ліку праводзячы *дэсербізацыю* Косава.

Гэта актуалізуе праблемы абавязкаў дзяржавы па абароне нацыянальнай ідэнтыфікацыі тытульнай нацыі, яе каштоўнасцяў і традыцый; праблемы мэтанакіраванай палітыкі фарміравання талерантнага стаўлення нацыянальных меншасцяў да тытульнай нацыі. Фактычна Беларусь мае патрэбу ў карэктыроўцы палітыкі ў галіне міжнацыянальных зносін (далей – нацыянальная палітыка). Гэта мала тычыцца традыцыйна прадстаўленых у Беларусі этнічных груп (рускія-стараверы, палякі, літоўцы, украінцы, яўрэі, татары, асобы, якія пераехалі пад час СССР і г.д.), але ў большай ступені тычыцца асоб, нядаўна абраўшых Беларусь месцам жыхарства. Разглядаючы Беларусь проста як зручнае *месца* для пражывання, яны могуць не ўспрымаць і ігнараваць яе нацыянальную культуру і мову.

Адной з умоў набыцця грамадства з'яўяецца веданне *адной* з дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь у межах, неабходных для разумення (абзац трэці часткі першай арт. 14 Закона "Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь"[1]). Беларусь, кіруючыся прынцыпам пазбягання выпадкаў без грамадзянства, прадстаўляе грамадзянства па нараджэнню дзецям, якія нарадзіліся на яе тэрыторыі, калі на дзень нараджэння бацькі дзіцяці, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, з'яўляліся асобамі без грамадзянства (абзац трэці арт. 13 Закона "Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь"[1]). Веданне другой мовы, нацыянальнай гісторыі, культуры і г.д. ад сускальніка (яго бацькоў) грамадзянства Беларусі не патрабуецца. Пры гэтым "валоданне заявіцелем адной з дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь ў межах неабходных для разумення, высвятляецца

службовай асобай органа унутраных спраў, ажыццяўляючым прыём дакументаў, аб чым робіцца запіс ў анкеце» (п. 21 Палажэння "Аб парадку разглядання пытанняў, связаных з грамадзянствам Рэспублікі Беларусь"[3]). Акрамя пэўнай карупцыягеннасці нормы гэта *зніжае* патрабаванні да ведання дзяржаўных моў. Больш адпаведным было б правядзенне субяседвання кваліфікаванай камісіяй па праграме, утрымліваючай пытанні нацыянальнай гісторыі, культуры і г.д. Гэта стымулявала б суіскальніка да вывучэння культуры і гісторыі Беларусі. Лічым, што існуючая практыка набыцця грамадзянства ў *перспектыве* можа ўзмацніць нацыянальнае напружанне, бо так развіваліся і косаўскія падзеі.

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь (далей – Канстытуцыя) у галіне нацыянальных адносін устанаўлівае прынцыпы:

1. дзяржаўнага рэгулявання адносін паміж нацыянальнымі і іншымі супольнасцямі на падставе прынцыпаў роўнасці перад законам, павагі іх праў і інтарэсаў (арт. 14);

2. адказнасці дзяржавы за захаванне гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыны, свабоднае развіццё культур усіх нацыянальных супольнасцяў, якія пражываюць у Рэспубліцы Беларусь (арт. 15);

3. права кожнага на захаванне сваей нацыянальнай прыналежнасці;

4. забароны прымусу вызначаць і называць нацыянальную прыналежнасць;

5. адказнасці за абразу нацыянальнай годнасці;

6. права кожнага карыстацца роднай мовай, выбіраць мову разумення;

7. гарантый на свабоду выбара мовы выхавання і навучання (арт. 50);

8. абавязкаў кожнага, хто знаходзіцца на тэрыторыі Беларусі, паважаць яе нацыянальныя традыцыі.

Па аналогіі з часткай другой арт. 16 Канстытуцыі можна сцвярджаць, што роўнасць нацыянальный супольнасцяў перад законам не азначае раўназначнасці гэтых супольнасцяў перад нацянальнай гісторыяй Беларусі. Гэта значыць, што нацыянальная палітыка павінна будавацца з улікам уплыва супольнасцяў "на фарміраванне духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа". Пры яе рэалізацыі любая дзяржава можа сутыкнуцца з праблемамі нацыяналізма, праявамі нацыянальнай варожасці і г.д. або з *абвінавачваннямі* ў гэтым, у тым ліку *палітызыванымі* і *галаслоўнымі*. Беларусь забараняе стварэнне і дзейнасці любых грамадскіх аб'яднанняў, вядучых прапаганду нацыянальнай варожасці (частка трэцяя арт. 5 Канстытуцыі). Аднак такая варожасць можа быць *двухбаковай*.

Беларусі трэба падтрымліваць *аптымальны баланс* паміж інтарэсамі беларусаў як тытульнай нацыі і інтарэсамі іншых нацыянальных супольнасцяў. Асноўным нацыянальным інтарэсам з'яўляецца захаванне нацыянальнай самаідэнтыфікацыі (прыналежнасці), якая можа існаваць у этнічным і культуралагічным аспектах. У першым выпадку змена нацыянальнасці немагчыма (інда-еўрапеец, мангалоід, негроід г.д.), аднак чалавек можа быць выхаваны ў культуры іншага этнаса, атаясамляючы сябе з апошнім у культуралагічным аспекце. Напрыклад, сямігадовы тэрмін пражывання на тэрыторыі Беларусі (як умова прыняцця ў грамадзянства) можа скарачацца або не прымяняцца для "асоб, якія ідэнтыфікуюць сябе як беларусы, і іх нашчадкаў, нарадзіўшыхся па-за межамі

сучаснай тэрыторыі” Беларусі (абзац другі часткі трэцяй арт. 14 Закона “Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь”[1]).

Арт. 50 Канстытуцыі гарантуе кожнаму права на захаванне сваёй нацыянальнай прыналежнасці і забараняе прымус да яе вызначэння і называння. На жаль, хоць частка другая пункта 11 Палажэння “Аб пашпарце грамадзяніна Рэспублікі Беларусь [2] устанаўлівае, што “са згоды грамадзяніна робіцца запіс аб нацыянальнай прыналежнасці ўладальніка пашпарту”, бланк заявы аб выдачы пашпарту графы “нацыянальнасць (па жаданню)” не ўтрымлівае і згода (незгода) асобы не высветляецца. Спробы ўнесці ў пашпарт нацыянальную прыналежнасць у кампетэнтных органах для беларусаў – грамадзян Беларусі звычайна бываюць няўдалымі.

Такі ўціск магчымасці легальнага выражэння нацыянальнай прыналежнасці ў будучыні можа абцяжарыць рэалізацыю пэўных праў. Напрыклад, п. 3 Правіл прыёма ў вышэйшыя навучальныя установы[4] дазваляе асобам “беларускай нацыянальнасці, якія з’яўляюцца грамадзянамі замежных краін,  або асобамі без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі замежных краін” удзельнічаць у конкурсе на атрыманне вышэйшай адукацыі ў дзяржаўных ВНУ за кошт бюджэта. Да гэтага часу (студэнты набора 2007 г. нарадзіліся ў 1989 – 1990 гг.) нацыянальнасць дакументальна падцвярджвалася  савецкімі пасведчаннямі аб нараджэнні. Гэта значыць што праблема можа стаць актуальнай ўжо ў гэтым годзе.

На нацыянальную палітіку ўплывае наяўнасць у Беларусі дзвюх дзяржаўных моў. На нашу думку, гэта патрабуе *забяспячэння аднолькавага ўзроўню валодання* імі. Пры наяўнасці права на выбар мовы разумення (арт. 50 Канстытуцыі) неабходна *ўлічваць магчымасць* таго, што асобы, аддаючы прыарытэт рускай мове, будуць ігнараваць беларускую. Гэты эфект можа ўзмацняцца пры абранні Беларусі як устойлівай стабільнай дзяржавы ў якасці месца жыхарства асобамі іншых нацый, для якіх больш важным будзе захаваць *сваю* нацыянальную ідэнтычнасць. Пры гэтым ігнараванне такімі асобамі беларускай мовы як сродка разумення (бо ёсць магчымасць выкарыстаць рускую) пры талерантнасці беларусаў да іных нацый можа ў *перспектыве* прывесці да негатыўных эфектаў.

Такім чынам, вызначаецца неабходнасць унясення зменаў у заканадаўства ў галіне нацыянальнай палітыкі, у тым ліку забяспечваючых абавязковасць роўных ведаў дзяржаўных моў. Было б пажадана ўвесці абавязковую здачу ўступных іспытаў па дзвюх мовах, абавязковае веданне дзвюх моў асобамі, якія пастулююць на дзяржаўную службу, публікацыю нарматыўных актах на дзвюх мовах, змяненне практыкі вызначэння нацыянальнай прыналежнасці і г.д. Гэта дазволіць прадухіліць магчымую нацыянальную напруджаннасць, у тым ліку па Косаўскаму варыянту.

Літаратура

1. О гражданстве Республики Беларусь: Закон Респ. Беларусь, 1 авг. 2002 г., № 136-З // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 8 авг. 2002 г. – № 88. – 2/885.

2. Об утверждении Положения о паспорте гражданина Республики Беларусь, образца этого паспорта и описания его: Постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 14 июля 1993 г., № 463 // Собрание постановлений Правительства Респ.

Беларусь. – 1993. – № 20. – арт. 387.

3. Об утверждении Положения о порядке рассмотрения вопросов, связанных с гражданством Республики Беларусь, и образовании при Президенте Республики Беларусь комиссии по вопросам гражданства: Указ Президента Респ. Беларусь, 17 нояб. 1994 г., № 209 // Сборник действующих нормативных правовых актов Президента Респ. Беларусь (1994-2000). – Минск: 2001.

4. Правила приема в высшие учебные заведения: Указ Президента Республики Беларусь, 7 февр. 2006 г., № 80 // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2006. - № 24. – 1/7235.